ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта
А.В.Клімовіч
"13" ___ 2025 г.

ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсаў "Лепшы млынар Гродзеншчыны" і "Хлебнае багацце Гродзеншчыны" ў рамках абласнога свята млынароў

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення конкурсаў "Лепшы млынар Гродзеншчыны" і "Хлебнае багацце Гродзеншчыны" ў рамках абласнога свята млынароў (далей – Конкурсы).

2. Мэтамі і задачамі Конкурсаў з'яўляюцца: захаванне і папулярызацыя рэгіянальных асаблівасцей традыцыйнай культуры Гродзеншчыны; папулярызацыя элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, розных відаў і жанраў традыцыйнай культуры; удасканаленне прафесійнага майстэрства і выканальніцкай культуры ўдзельнікаў свята; далучэнне жыхароў і гасцей аграгарадка да лепшых узораў музычнага, дэкаратыўна-прыкладнога і іншых відаў і жанраў традыцыйнага мастацтва; арганізацыя традыцыйных форм вольнага часу жыхароў Гродзеншчыны.

3. Конкурсы праводзяцца **8 лістапада 2025 г.** у рамках абласнога свята млынароў на базе Адэльскага цэнтра культуры і народнай творчасці філіяла ДУК "Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр".

4. Арганізатарамі Конкурсаў з'яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама (далей – упраўленне), дзяржаўная ўстанова культуры "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" (далей – ГУК "Гродзенскі АМЦНТ"), аддзел культуры Гродзенскага раённага выканаўчага камітэта (далей – аддзел), дзяржаўная ўстанова культуры "Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр" (далей – цэнтр).

5. Для арганізацыі і правядзення Конкурсаў створаны арганізацыйны камітэт (далей – аргкамітэт) (Дадатак 1).

6. У Конкурсах прымаюць удзел прадстаўнікі ўсіх раёнаў Гродзенскай вобласці і іншых абласцей Беларусі, якія ўдзельнічаюць у

святочным шэсці, тэатралізаваным адкрыцці і дэфіле-парадзе гаспадынь з традыцыйным хлебам хатняй выпечкі і млынароў Гродзеншчыны.

Ад Гродзенскага раёна ў конкурсе “Лепшы млынар Гродзеншчыны” удзельнічаюць не менш за 3 удзельнікаў-млынароў (па колькасці населеных пунктаў, дзе млыны былі распаўсюджаны).

У конкурсе “Хлебнае багацце Гродзеншчыны” абавязкова прымаюць удзел носьбіты элементаў катэгорыі “традыцыйная ежа”, якія ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей, з абавязковым правядзеннем майстар-класаў.

7. Касцюмы ўдзельнікаў Конкурсаў павінны адпавядаць варыянтам копій ці арыгіналаў народных строяў сваёй мясцовасці.

8. Для ўдзелу ў конкурсе “Лепшы млынар Гродзеншчыны” ўдзельнікі рыхтуюць інтэрактыўную візітоўку (да 10 хвілін) з выкарыстаннем начыння працэсу памолу, апрацоўкі, выкарыстання зерня (драўляны млын, жорны, сіта, мяшкі з зернем/мукой, сявенька, кораб, бязмен і інш.). Касцюм, абутак, галаўны ўбор удзельнікаў конкурса павінны адпавядаць вобразу млынара адпаведнай мясцовасці.

9. Пераможцаў конкурсу “Лепшы млынар Гродзеншчыны” вызначае кампетэнтнае журы (Дадатак 2). У конкурсе журы вылучае лаўрэатаў I, II, III ступені, узнагароджвае іх дыпломамі ў рамках і прызамі.

10. Пры падвядзенні вынікаў конкурсу “Лепшы млынар Гродзеншчыны” журы ўлічвае:

рэжысёрскае вырашэнне інтэрактыўнай візітоўкі;

даступнасць і нагляднасць дэманстрацыі тэхналагічных і творчых працэсаў;

выкарыстанне народных традыцый і звычаяў, іх тактоўную інтэрпрэтацыю ў адпаведнасці з сучаснымі ўмовамі;

узровень выканальніцкага майстэрства.

11. Для ўдзелу ў выстаўцы-конкурсе “Хлебнае багацце Гродзеншчыны” ўдзельнікі гатуюць хлебабулачныя вырабы з дэгустацыяй у трох намінацыях: “Традыцыйны хлеб хатняй выпечкі”, “Традыцыйнае печыва”, “Сучаснае печыва з мукі”. У кожнай намінацыі журы (Дадатак 2) вылучае лаўрэатаў I, II, III ступені, узнагароджвае іх дыпломамі ў рамках і прызамі.

12. Пры падвядзенні вынікаў конкурсу “Хлебнае багацце Гродзеншчыны” журы ўлічвае:

адпаведнасць мясцовым кулінарным традыцыям;

адпаведнасць знешняга выгляду конкурсных вырабаў заяўленым назвам;

высокі ўзровень і эстэтычнасць хлебабулачных вырабаў;

выкарыстанне ўпрыгожванняў і дэкору вырабаў з цеста з натуральных інгрэдыентаў;

наяўнасць этыкеткі з інфармацыяй аб конкурсных хлебабулачных вырабах (назва; месца бытавання; прозвішча, імя, імя па бацьку вытворцы); рэцэпта з апісаннем прыгатавання (асноўныя этапы, складнікі).

13. Усе астатнія ўдзельнікі Конкурсаў узнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел.

14. Журы пакідае за сабой права ў рамках агульнага прызавога фонду аб'ядноўваць, падзяляць прызавыя месцы, вызначаць дадатковыя намінацыі.

15. Рашэнне членаў журы па выніках конкурсаў фіксуецца ў пратаколе (падпісваюць усе члены журы), які размяшчаецца не пазней 10 каляндарных дзён з дня правядзення на афіцыйным сайце ДУК "Гродзенскі АМЦНТ".

16. Рашэнне журы з'яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

17. Для ўдзелу ў Конкурсах неабходна да 20 кастрычніка 2025 г. на электронны адрас ДУК "Гродзенскі АМЦНТ" info@gromc.by даслаць заяўку з адзнакай "Конкурсы свята млынароў" (Дадатак 3).

18. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення Конкурсаў, а таксама пераносіць дату правядзення (у іншыя тэрміны).

19. Фінансаванне Конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК "Гродзенскі АМЦНТ".

20. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: набыццё прызоў, рамак для дыпломаў і выраб дыпломаў.

21. Для фінансавання Конкурсу могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Дадатак 1
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення Конкурсаў у рамках абласнога свята млынароў

**СКЛАД АРГКАМІТЭТА**
**конкурсаў “Лепшы млынар Гродзеншчыны” і “Хлебнае багацце Гродзеншчыны”**

| | |
|---|---|
| Клімовіч Алена Віктараўна | начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня аргкамітэта;* |
| Кузьма Таццяна Мікалаеўна | начальнік аддзела культуры Гродзенскага райвыканкама, *сустаршыня аргкамітэта;* |
| Пекар Анастасія Юр’еўна | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *намеснік старшыні аргкамітэта;* |
| Грынцэвіч Аксана Аляксееўна | дырэктар дзяржаўнай установы культуры “Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр”; |
| Рамановіч Наталля Іосіфаўна | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Барысевіч Яніна Анатольеўна | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” |

Дадатак 2
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення Конкурсаў у рамках абласнога свята млынароў

**Склад журы конкурсаў**
**“Лепшы млынар Гродзеншчыны”**
**і “Хлебнае багацце Гродзеншчыны”**

| | |
|---|---|
| Клімовіч Алена Віктараўна | начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня журы;* |
| Кузьма Таццяна Мікалаеўна | начальнік аддзела культуры Гродзенскага райвыканкама, *сустаршыня журы*; |
| Пекар Анастасія Юр’еўна | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *намеснік старшыні журы;* |
| Барысевіч Яніна Анатольеўна | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Рамановіч Наталля Іосіфаўна | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Пятрук Андрэй Пятровіч | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” |

Дадатак 3
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення Конкурсаў у рамках абласнога свята млынароў

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік (загадчык) аддзела (сектара) культуры
гар(рай)выканкама
“___” _____________2025 г.

ЗАЯЎКА
**на ўдзел у Конкурсах**
**“Лепшы млынар Гродзеншчыны”**
**і “Хлебнае багацце Гродзеншчыны”**

1. Раён, установа_________________________________________
2. Конкурсы у якіх удзельнічае раён (установа) _________________________________________________________________
3. Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельнікаў Конкурсаў:
   Конкурс “**Лепшы млынар Гродзеншчыны**”:_______________
   Конкурс “**Хлебнае багацце Гродзеншчыны**”:

а) “Традыцыйны хлеб хатняй выпечкі” - ____________________________
б) “Традыцыйнае печыва” - __________________________________________
в) “Сучаснае печыва з мукі” - ______________________________________

4. Кантактныя тэлефоны_____________________________________

Кіраўнік базавай установы

____________________ ___________
*(ініцыялы, прозвішча)* *(подпіс)*